**УДК 342.538**

# ПАРЛАМЕНТСКІЯ ПАСЯДЖЭННІ: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ І ПРАКТЫКА ІХ РЭАЛІЗАЦЫІ

***К.М. ІВАНОВІЧ***
***(Прадстаўлена: канд. юрід. навук, дац. Д.В. ШЧЭРБІК)***

*Разглядаюцца сутнасць парламентскіх пасяджэнняў, прычыны дэфармацыі такой формы дзейнасці дэпутатаў парламенту, а таксама магчымыя спосабы выхаду з існуючага крызіснага становішча.*

Па тэорыі парламентарызму адной з асноўных форм дзейнасці дэпутатаў парламенту з’яўляецца ўдзел у парламентскіх пасяджэннях. І сапраўды, тутсправядліва адзначыць, што само слова «парламент» паходзіць ад французскага «parler» – мовіць, таксама падкрэслівае сутнаснае прызначэнне дзейнасці дэпутатаў.

Так, У.М.Гесэн адзначаў, што «большое преимущество представителей заключается в том, что они способны обсуждать дела. Народ совершенно к этому непригоден: это и является одним из больших недостатков демократии» [2].

Парламентскія пасяджэенні з’яўляюцца арганізацыйнай формай дзейнасці палат і заключаецца ў заслухоўванні меркаванняў членаў палаты, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, экспертаў па канкрэтных законапраектах ці іншым пытанні, што ўваходзяць у кампетэнцыю парламента, а таксама ў наступным іх абмеркаванні і выпрацоўванні шляхам дэбатаў дзяржаўнай палітыкі, якая адпавядае інтарэсам дзяржавы, і на яе аснове вызначаюць і выбудоўваюць сістэму заканадаўства.

І сапраўды, як сцвярджае тэорыя, парламентскія пасяджэнні, пабудаваныя на аснове дыялогу, з’яўляюцца аптымальнай формай выражэння менавіта агульнай волі: дэпутаты выказваюць свае меркаванні, ацэньваюць, спрачаюцца і г.д., прымаючы такім чынам найбольш аптымальныя рашэнні, бо як пісаў Сакрат: «В споре рождается истина» [5, с. 151].

Аднак, неабходна адзначыць, што на практыцы парламентскія пасяджэнні не так эфектыўны з-за шэрагу прычын. Па-першае, праца палат выглядае даволі маруднай, бо патрабуе збору хаця б кворуму. Менавіта таму ў нашай краіне Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 красавіка 2002 г. № 205 «Аб Канцэпцыі ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь» у арт. 18 абз. 2 замацоўваецца палажэнне аб тым, што ў выпадку асаблівай неабходнасці ў аператыўнай змене прававога рэгулявання грамадскіх адносін варта выкарыстоўваць дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [4]. Адсюль фактычна вынікае прызнанне на дзяржаўным узроўні таго факту, што аператыўна рэагаваць можа толькі Прэзідэнт, але ніяк не Парламент.

Прыкладам маруднай працы парламенту можна прывесці ратыфікацыю Вярхоўнай Радай пагаднення Украіны і Японіі, якая працягвалася паўтара года. Сутнасць пагаднення заключаецца ў тым, што Японія вылучае Ўкраіне льготны мэтавы крэдыт, які быў выгадны абодвум бакам. Аднак, у выніку, працягвалася гэтая працэдура да пачатку верасня 2015 г. [3].

Другім аргументам не на карысць парламентскіх пасяджэнняў можна назваць фармалізацыю дэбатаў і абмеркаванняў з-за фактычнага складу палат, бо калі раней прадстаўнікамі волі народа абіраліся найбольш разумныя і выбітныя дзеячы, якія маглі прадстаўляць інтарэсы народу, то ў сучаснасці парламенты фарміруюцца партыямі, у склад якіх уваходзяць людзі даволі розныя.Так, у сучасным саставе Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыіі можна ўбачыць баксёра Мікалая Валуева, мастацкую гімнастку Аліну Кабаеву, салістку Марыінскага тэатру Марыю Максакаву-Ігенбергс, дзюдаіста Дзмітрыя Носава, тэнісіста Марата Сафіна і г.д. [6].

Таксама адной з важных праблем, звязаных менавіта з складам палат, неабходна адзначыць павелічэнне колькасці прадстаўнікоў радыкальных партый і іх уплывовасці ў парламентах. Напрыклад, на датэрміновых парламентскіх выбарах у Грэцыі, якія прайшлі не так даўно, перамагла галоўная апазіцыйная партыя Кааліцыя радыкальных левых сіл (СІРІЗА – акронім ад грэч. Συνασπισμός Ριζοσπαστικής Αριστεράς – Кааліцыя радыкальных левых). Як сведчаць вынікі, апублікаваныя вядучымі мясцовымі тэлеканаламі адразу пасля закрыцця выбарчых участкаў, яна набрала 36,34 % галасоў, атрымаўшы такім чынам 149 месцаў у 300–мясцовым аднапалатным парламенце краіны [1]. Якімі будуць наступствы такога выбару пакажа толькі час.

Такі склад супярэчыць аднаму з асноўных прынцыпаў дзейнасці парламенту: прынцыпу прафесіяналізму дэпутатаў. Больш таго, ад дэпутата патрабуюцца веды ў некалькіх прадметных галінах, у ліку якіх і юрыспрудэнцыя, і эканоміка. Асабліва іх неабходнасць актуалізуецца ў працэсе абмеркавання і прыняцця бюджэту.

Аднак, можна прапанаваць некалькі даволі рэальных спосабаў выхаду з існуючага становішча. Напрыклад, В.Б. Ісакаў, загадчык Прававога ўпраўлення Апарату Дзяржаўнай Думы ФС РФ, прапанаваў ідэю вертыкальна інтэграванага парламента [7]. Па сутнасці, гэтая прапанова азначае, што аб'яднанне парламента, дэпутатаў неабходна праводзіць не як цяпер гэта адбываецца, калі іх абіраюць, і на працягу нейкага пэўнага часу яны калектыўна абмяркоўваюць увесь спіс пытанняў, а аб'ядноўваць дэпутатаў на розных узроўнях і па прафесійным прынцыпе, каб пытанні абмяркоўваліся толькі людзьмі дасведчанымі.

Яшчэ адным выйсце можа стаць атрыманне дэпутатамі абавязковай дадатковай адукацыі пасля абрання, калі будзе мець месца такая неабходнасць. Для гэтага можна выкарыстаць таксама існуючую ў сучасных парламентах з’яву партыйнага прадстаўніцтва: неабходна, каб кожная палітычная партыя думала аб сваім палітычным «рэзерве», каб менавіта партыя, выкарыстоўваючы свае ўласныя сродкі, рыхтавала будучых парламентарыяў. Так, у палітычных партый будзе рэальная патрэба знаходзіць кваліфікаваных эканамістаў, кваліфікаваных юрыстаў, іншых людзей, якія змогуць прафесійна займацца палітычнай дзейнасцю.

Яшчэ адным спосабам паляпшэння якасці працы парламенту можна прапанаваць перанос заканатворчай функцыі парламенту ў бок выканаўчай улады (прэзідэнту або ўраду) па сродках дэлегавання законатворчых паўнамоцтваў з павелічэннем уплывовасці кантрольнай функцыі ў дзейнасці парламенту і надзяленнем яго паўнамоцтвамі па выданню законаў-рамак.

Важным напрамкам кантрольнай працы парламента павінен стаць маніторынг дзеючага заканадаўства. Галоўная мэта тут – выяўленне і ліквідацыя прабелаў і калізій у заканадаўчай і нарматыўнай базе, скарачэнне разыходжанняў розных заканадаўчых актаў і іх дубліравання, а таксама скарачэнне колькасці адсылачных норм.

Таксама замацаванне кантрольнай функцыі як асноўнага кірунку дзейнасці парламента істотна паспрыяе паляпшэнню сістэмнасці працы дэпутатаў парламента ў сваіх выбарчых акругах, накіраванай на выяўленне паспяховасці дзеяння прынятых законаў, выяўленне прававых актаў, у прыняцці якіх мае патрэбу сучасная практыка, аналіз эфектыўнасці дзейнасці мясцовых адміністрацый, а таксама высвятленне праблем, якімі жывуць выбаршчыкі, і пошук неабходных спосабаў іх вырашэння.

ЛІТАРАТУРА

1. В Греции на парламентских выборах победили левые радикалы [Электронный ресурс]. – 2015. – Рэжым доступу: http://www.svoboda.org/content/article/26813210.html. – Дата доступу: 07.09.2016.
2. Гессен, В.М. Основы конституционного права [Электронный ресурс] / В.М. Гессен. – Изд. 2-е. – Петроград : Право, 1918. – 2014. – Рэжым доступу: http://constitution.garant.ru/science-work/pre-revolutionar/5148630. – Дата доступу: 07.09.2016.
3. Еременко, А. Кризис парламентаризма в Украине [Электронный ресурс] / А. Еременко. – Рэжым доступу: http://hvylya.net/analytics/politics/krizis-parlamentarizma-v-ukraine.html. – Дата доступу: 07.09.2016.
4. Канцэпцыя ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь : зацв. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 10 красавіка 2002 г., № 205 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2002. – № 46. – 1/3636.
5. Кессиди, Ф.Х. Сократ / Ф.Х. Кессиди. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб. : Алетейя, 2001. – 367 с.
6. Состав Государственной Думы шестого созыва [Электронный ресурс]. – 2015. – Рэжым доступу: http://www.duma.gov.ru/structure/deputies. – Дата доступу: 07.09.2016.
7. Щербинин, А.И. Некоторые проблемы парламентаризма в современной России [Электронный ресурс] / А.И. Щербинин. – 2016. – Рэжым доступу:http://duma.tomsk.ru/content/8_nekotorye_problemy_parlamentarizma_v_sovremennoj_rossii. – Дата доступу: 07.09.2016.